**І. А. Саракавік**

# БЕЛАРУСКА-ГЕРМАНСКІЯ НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ (1920-я – пачатак 1930-х гг.)

З утварэннем савецкай Беларусі востра паўстала пытанне аб падрыхтоўцы кадраў для ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства. Вастрыня заключалася ў тым, што на гэты час у рэспубліцы не існавала ўстаноў вышэйшай школы, а разам з гэтым і адпаведных навуковых кадраў. Першым

крокам у вырашэнні гэтай праблемы стала адкрыццё ў 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на чале з ужо добра вядомым вучоным прафесарам Уладзімірам Іванавічам Пічэтам (9(21).10.1878 – 23.06.1947). У першыя гады яму ўдалося, не без цяжкасцяў, арганізаваць калектыў кваліфікаваных вучоных, здольных выкладаць дысцыпліны на высокім навуковым і метадычным узроўнях. Большасць з іх была запрошана з Расіі і Украіны. Праўленне БДУ пайшло нават на тое, што дзесяць прафесараў праводзілі заняткі «вахтавым» метадам, прыязджалі, як правіла на два месяцы два–тры разы на працягу вучэбнага года, паколькі жылі ў іншых гарадах Савецкага Саюза [1, воп. 1, спр. 1145, арк. 97, 154].

Дзеля павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу выкарыстоўваліся розныя кірункі, адным з іх сталі навуковыя сувязі з замежнымі навуковымі і навучальнымі ўстановамі. Пачыналіся яны з абмену навукова-вучэбнай літаратурай. У фондзе БДУ, які знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, захоўваюцца справы аб перапісцы Праўлення БДУ, яго падраздзяленняў з шэрагам навуковых устаноў Еўропы, у тым ліку і Германіі. Адна з першых адносіцца да 1923 г. – 7 лістапада дэкан педагагічнага факультэта прасіў Праўленне ўніверсітэта накіраваць тры кнігі (№ 1, 2, 3, 4, 5) «Прац БДУ» Балтыйскаму і Славянскаму інстытутам Лейпцыгскага ўніверсітэта па іх просьбе. З матэрыялаў бачна, што ўжо 12 лістапада гэтыя «Працы БДУ» былі накіраваны адрасату [1, воп. 1, спр. 91, арк. 1, 21].

Абмен навуковай літаратурай адбываўся і ў наступныя 20-я гады, ажно амаль да першай паловы 30-х гадоў. У справе спісу навуковых устаноў, якім былі накіраваны навуковыя «Працы БДУ» за 1928–1929 гг., значацца ўніверсітэты ў Гамбургу, Лейпцыгу, Кёнігсбергу, Берліне [1, воп. 1, спр. 341, арк. 5, 29, 33, 35], а за 1932–1933 гг. – Гамургскі, Марбургскі, Лейпцыгскі, Берлінскі ўніверсітэты Нямеччыны, а таксама яе земляў Гэцінг і Дрэздэн [1, воп. 1, спр. 550, арк. 6, 7].

Часам «Навуковыя працы БДУ» накіроўвалі персанальным асобам у замежжа.Так, спіс навукоўцаў, якім былі накіраваны «Працы БДУ» № 23, выглядае наступным чынам: І. Лешчынскі – Берлін, Чэрыкавер для Дубнова – Берлін, С. Мернін – Данцыг, доктар М. Вішніцэр – Берлін, Д. Чорны – Берлін [1, воп. 1, спр. 341, арк. 139].

Універсітэт не толькі накіроўваў сваю навуковую літаратуру за мяжу, але і прымаў меры па яе абмену, а таксама па падпісанні перыядычнай літаратуры за межамі СССР. 22 лютага 1926 г. Праўленне БДУ прасіла Народны камісарыят фінансаў БССР дазволіць перадачу ў адрас кніжных крамаў Гарасьвіца ў Лейпцыгу, Баша ў Берліне, Гашэд у Парыжы па 1 200 руб. на перыядычныя выданні, якія выпісваюцца для дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэк на бягучы год згодна сметы ўніверсітэта [1, воп. 1, спр. 215, арк. 5].

На гэты час 55 выданняў выпісваліся, а таксама прыходзілі ў якасці абмену на нямецкай мове, 26 – на французскай, 9 – на англійскай і 4 – на польскай мовах [1, воп. 1, спр. 215, арк. 14–17].

Аднак толькі абменам навуковай літаратуры ўзаемасувязі не абмяжоўваліся. За гэтым кірункам адносін лагічна паследаваў наступны: непасрэднае знаёмства беларускіх навукоўцаў з дасягненнямі нямецкай навукі ў яе розных галінах ва ўніверсітэтах Германіі. Такія паездкі беларускіх даследчыкаў першапачаткова адбываліся толькі з дазволу адпаведных органаў Расійскай Федэрацыі. 23 мая 1923 г. рэктар БДУ прафесар У. І. Пічэта ад імя Праўлення ўніверсітэта прасіў Галоўпрафобр РСФСР (савет па справах вну) дазволіць прафесару М. Б. Кролю навуковую камандзіроўку за мяжу на час летніх канікул с 1 ліпеня па 1 верасня за яго асабістыя грошы. Роўна праз месяц Праўленне БДУ прасіла ўжо Акадэмічны цэнтр Народнага камісарыята асветы РСФСР дазволіць навуковыя камандзіроўкі за мяжу прафесарам Я. Я. Сіроткіну, У. М. Перцаву, У. М. Іваноўскаму і М. М. Нікольскаму [1, воп. 1, спр. 102, арк. 40, 48].

Такі падыход дзейнічаў і ў наступныя гады. Напрыклад, у плане замежных навуковых камандзіровак БДУ на 1926/27 год на час летніх адпачынкаў значыліся паездкі па факультэту права і гаспадаркі 3 чалавек (У. І. Пічэты, С. Я. Вольфсона, У. М. Перцава), педагагічнаму факультэту – 4, медыцынскаму факультэту – 5 чалавек. Усяго 12, з іх 2 чалавекі ў Польшчу і Чэхаславакію, астатнія 10 – у Нямеччыну. Без выдачы грошай на камандзіроўкі прадугледжвалася па медыцынскаму факультэту – 8 чалавек, з іх 2 – у Францыю і 6 – у Нямеччыну [1, воп. 1, спр. 216, арк. 41].

Адным камандзіраванне неабходна было для завяршэння працы над манаграфіямі, другім – для пераймання лепшага вопыту працы, для трэціх – для азнаямлення з арганізацыяй працы навуковых і вышэйшых навучальных устаноў, чацвёртым – для ўдзелу ў навуковых канферэнцыях, працы ў лабараторыях і т.д.

Паездкі ў Нямеччыну беларускіх навукоўцаў адбываліся і ў наступныя гады з той толькі адметнасцю, што цяпер кандыдатуры для іх павінны былі дакладна і поўна абмяркоўвацца ў прадметных камісіях і ў дэканатах. Накіроўваць за мяжу сталі не толькі прафесараў і дацэнтаў, але і асістэнтаў і аспірантаў. 5 снежня 1927 г. асістэнт А. Рубашова прасіла дэканат факультэта права і гаспадаркі хадатайнічаць перад Праўленнем БДУ аб прадстаўленні ёй замежнай камандзіроўкі на час летніх канікул у Германію і Францыю. Мэта – «знаёмства з дзейнасцю выхаваўча-выпраўленчых устаноў для барацьбы з правапарушэннямі непаўналетніх». Камандзіраванне неабходна было для завяршэння навуковай працы. Прафесар В. М. Шыраеў падтрымаў яе просьбу [1, воп. 1, спр. 1193, арк. 52].

Важнае значэнне мела прававое рэгуляванне арганізацыі навуковых замежных камандзіровак. Менавіта з гэтай мэтай калегія Народнага камісарыята асветы БССР 2 лістапада 1928 г. зацвердзіла «Правілы камандзіравання Галоўнавукай НКА навуковых працаўнікоў для ўдасканалення навуковай кваліфікацыі». У адпаведнасці з імі навуковыя працаўнікі вну і навукова-даследчых устаноў для ўдасканалення і заканчэння сваёй навуковай кваліфікацыі мелі права атрымаць камандзіроўку для працы ў навуковых

цэнтрах як саюзных рэспублік, так і за мяжою. У першую чаргу яны даваліся малодшым катэгорыям навуковых працаўнікоў тэрмінам да двух гадоў. Пры камандзіраванні тэрмінам не больш шасці месяцаў навуковыя працаўнікі мелі права захаваць сваю пасаду і пенсію (зарплату – заўвага – *І. С.*), а больш чым паўгода – здымацца з пасад і пенсій па ўстанове і атрымліваць ад Наркамата асветы стыпендыю (нежанатыя – 100 руб., сямейныя – 150 руб., штомесячна). Выдаткі, звязаныя з атрыманнем пашпарту і віз, а таксама падарожныя выдаткі і аплата (за межамі) навуковым кіраўнікам заняткаў і ўстановам, дзе камандзіраваныя будуць працаваць, ажыццяўлялася за кошт Наркамата асветы. У той жа час усе камандзіраваныя абавязаны былі прадастаўляць у Галоўнавуку дэталёвую справаздачу аб сваёй працы ў час камандзіроўкі да шасці месяцаў пасля яе, а звыш шасці месяцаў – праз кожныя паўгода [1, воп. 1, спр. 1193, арк. 63]. Адначасова ўстанаўлівалася правіла, згодна з якім для паездкі за мяжу з 1928 г. патрэбен быў дазвол Дзяржплана БССР [1, воп. 1, спр. 266, арк. 28].

Тым асобам, якія накіроўваліся за мяжу, выдаваўся спецыяльны дакумент. Так, 22 верасня 1928 г. за № 10994 выдадзена пасведчанне аб тым, што «асістэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ярмошенка Мікола Тодараў камандыруецца Наркамам асьветы ў Берлінскі ўніверсітэт (Нямеччына) для павышэньня кваліфікацыі, тэрмінам на два гады, што падпісалі і пячаткай сьведчыцца» [1, воп. 1, спр. 408, арк. 8].

З матэрыялаў архіва бачна, што і ў 1930 г. Праўленне БДУ прасіла Народны камісарыят асветы БССР камандзіраваць за кошт сродкаў Наркамата прафесара Я. А. Вайсмана ў Нямеччыну і Францыю для вывучэння становішча прамысловасці і замежнага гандлю гэтых краін; прафесара О. Гаўсмана ў верасні 1930 г. для чытання лекцый на курсах па ўдасканаленні кваліфікацыі дактароў у Карлсбадзе, а таксама правядзення курса тэрапіі ў Кенігсбергу; прафесара Я. Корчыца – ў верасні ў Францыю і Нямеччыну (Гамбург, Мюнхен) для завяршэння навуковых прац і асістэнта па кафедры агульнай гігіены доктара З. К. Магілеўчыка (май – верасень) у Нямеччыну (Дрэздэн) на міжнародную гігіенічную выстаўку [1, воп. 1, спр. 408, арк. 73, 78, 86].

Навуковыя ўзаемадачыненні вышэйшых вучэбных устаноў БССР з нямецкімі ўніверсітэтамі ў 30-я гг. у Нацыянальным архіве выявіць не ўдалося. Прычынай такога становішча, на погляд аўтара, з’яўляюцца два фактары: рэпрэсіі савецкай улады супраць тых асобаў, у тым ліку прадстаўнікоў Наркамата асветы, вучоных, уключаючы прафесара У. І. Пічэту, якія праходзілі па справах вучоных і контррэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», а таксама прыход у студзені 1933 г. нацысцкай партыі на чале з А. Гітлерам да ўлады ў Германіі.

Такім чынам, выкладзены матэрыял сведчыць аб тым, што ў 20-х – пачатку 30-х гг. XX ст. найбольш актыўнымі навуковыя замежныя сувязі Беларусі былі з навуковымі і навучальнымі ўстановамі Германіі, што адпавядала ў цэлым кантэксту адносін СССР з дадзенай капіталістычнай

краінай. Аднак гэтыя адносіны першапачаткова, да сярэдзіны 20-х гг., ажыццяўляліся толькі са згоды Наркамасветы РСФСР, што сведчыла пра пэўны недавер да органаў дзяржаўнага кіравання БССР. Больш шырока беларуска-германскія навуко-выя сувязі наладжваліся прадстаўнікамі прыродазнаўчых і дакладных навук, дасягненні менавіта якіх былі востра патрэбны для развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі. З часам кантакты вну БССР з Германіяй былі ўнармаваны Правіламі Наркамата асветы Беларусі і падлягалі ведамаснаму кантролю. Працяглыя ж навуковыя кантакты бакоў сведчаць аб пэўнай іх эфектыўнасці. У той жа час неабходна прызнаць, што гэты працэс быў аднабаковым: назіраліся толькі паездкі беларускіх вучоных у Германію. Такое становішча з'яўлялася аб'ектыўным, так як у БССР адбываўся працэс толькі станаўлення навукі і ёй патрэбна было арыентавацца на высокія еўрапейскія дасягненні.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 205.